Евсеенко И.В., учитель белорусского языка и литературы

# Тэма: Знакі прыпынку ў сказах з параўнальнымі зваротамі, пабочнымі іўстаўнымі канструкцыямі, звароткамі.

Мэты: Сістэматызаваць веды вучняў пра знакі прыпынку ў сказах з параўнальнымі зваротамі, пабочнымі і ўстаўнымі канструкцыямі, звароткамі, замацаваць уменне правільна ставіць знакі прыпынку, фарміраваць пазнавальную актыўнасць вучняў, садзейнічаць развіццю камунікатыўных здольнасцей вучняў.

Эпіграф: Веды толькі тады веды, калі яны набыты намаганнямі сваёй думкі, а не памяццю.

## ХОД УРОКА

I. Арганізацыйны момант
II. Паведамленне тэмы і мэт урока
III. Актуалізацыя апорных ведаў
IV. Арфаграфічная размінка

Дэкальтэ, канапэ, глясэ, бурымэ, альмэ, кашнэ, купэ, медрэсэ, рэнамэ, фрыкасэ, саке, адажыа, капрычыа, парэа, трыа, мас-медыя, сальфеджыа, радэа, альма-матар, аўтсайдар, баластар, блістар, грэйдар, вінчэстар, карцар, світар, шніцаль.

V. Псіхалагічная падрыхтоўка вучняў да ўспрымання новага матэрыялу.
VI. VI.Вывучэнне новага матэрыялу.

Тлумачэнне новага матэрыялу з дапамогай інтэрактыўнай дошкі.

| | |
|---|---|
| **параўнальны зварот** | |
| **1. мае параўнальнае значэнне** | Зорка гарыць, свеціць, нібы каштоўны брыльянт. |
| **2. так, такі** | Вы сёння такі вясёлы, як ніколі. |
| **, параўнальны зварот** | |
| **1. = фразеалагізм** | Да вёскі было як рукою падаць. |
| **2. як = у якасці** | Абодвух іх ведалі як добрых хірургаў. |
| **3. як след<br>як мага<br>як трэба** | Мы імкнуліся працаваць як мага лепш. |
| **4.<br>Аднолькавыя словы** | Хата як хата. |
| **5. параўнальны зварот =** | Як кудзеля траўка тая. |
| **, зваротак** | |
| **1. З,….** | Не пакідай мяне, мой светлы розум.<br>Добры дзень, суседзе. |
| **2…, з, …** | |
| **3…, з.** | |
| **4. ты(вы), з…** | Ты, родны край, гармоніі нас вучыш. |

| | |
|---|---|
| **5. О з,…** | О Радзіма, табою напоўнена сэрца да краю. |
| **, пабочныя словы** | |
| **пабочныя словы ,** | Нішто, здавалася, не паказвала на новую бяду і выпрабаванні.<br>На шчасце, дождж перастаў. |
| **пабочныя канструкцыі** | |
| **як кажуць**<br>**як здалося**<br>**як думаюць**<br>**як сцвярджаюць** | Шчырага прывітання, як чакаў Кузьма, не атрымалася. |
| **-( устаўныя канструкцыі)-**<br>**словы, словазлучэнні і сказы, якія даюць дадатковую інфармацыю.** | |
| **-( )-** | Быстрынка – так называлася невялікая рачулка – ціха плыла сярод алешнікаў і вербалозу. |

**VII**. Фізкультхвілінка

**VIII**. Замацаванне новага матэрыялу.

1. Работа вучняў на інтэрактыўнай дошцы.

Паставіць знакі прыпынку(пунктуацыйны трэнажор).

Адсюль да ракі было не больш _ як дзвесце метраў.

Сонца прыгравала зусім_ як летам.

Хмара_ як чорны парасон.

Дзень _ як на заказ.

Зорка гарыць_ , нібы каштоўны брыльянт.

Ах_, вясна, як чакалі цябе мы!

Мой час_, пачакай, не бяжы.

О_ гай праменны_, табе паклон за хараство пачуццяў.

Інакш кажучы_, ты мне не верыш.

Гэта_, можна сказаць_, вельмі складаная задача.

Праўда_ даражэйшая за грошы.

Нарэшце_ хата ўжо гатова.

Ад’езд і радаваў_(дома чакала сустрэча з жонкай, з дзецьмі) і крышачку засмучаў.

2. Скласці сказы з наступнымі словамі і словазлучэннямі, каб яны аддзяляліся на пісьме коскамі і не.

| I рад | II рад | III рад |
|---|---|---|

| | | |
|---|---|---|
| кажуць | бывае | відаць |
| прызнацца | вядома | мусіць |
| Радзіма | Бацькаўшчына | Беларусь |
| як люстэрка | як выдатнік | як народны пісьменнік |
| здавалася Надзі | хацелася мне | а ён быў алімпіяднікам |

3. Выкананне практыкавання 235

**IX**. Рэфлексія.
Складанне сінквейна.
МОВА
РОДНАЯ,ПЯВУЧАЯ
ШАНУЮ,БЕРАГУ
ЛЕПШАЯ МОВА Ў СВЕЦЕ
СПАДЧЫНА

**X.** Выстаўленне ,каменціраванне адзнак.

**XI**. Дамашняе заданне. Міні-сачыненне” Маё маўленне без пабочных слоў і зваротkaў”.